# Агляд падзей тыдня паводле афіцыйных крыніц ЕС

Агляд падрыхтаваны Цэнтрам еўрапейскіх даследванняў

для Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі


Анонсы падзей 16-22 красавіка 2012 года ........ 1

Падзеі мінулага тыдня ........ 1

Сайт тыдня ........ 4


## Анонсы падзей 16-22 красавіка 2012 года

**16 красавіка** – ў Брусэлі адбываецца саміт ЕС “Устойлівая энергетыка для ўсіх”, падрыхтаваны Еўракамісіяй і дацкім старшынствам ЕС. У саміце прымуць удзел прэзідэнт Еўракамісіі Барозу і генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун. Больш інфармацыі пра саміт

**16-19 красавіка** – у Капенгагене адбудзецца канферэнцыя па ветравой энергетыцы, арганізаваная Еўрапейскай асацыяцыяй ветравой энергетыкі. Галоўнай тэмай сёлета будуць інавацыі. Больш інфармацыі пра канферэнцыю

**17-20 красавіка** – у Страсбургу адбудзецца пленарная сесія Еўрапарламента, падчас якой будуць разгледжаныя меры па пераадоленні эканамічнага крызіса, пытанні перадачы інфармацыі пра еўрапейскіх пасажыраў службам бяспекі ЗША, сітуацыя з правамі чалавека, праблема падаткаў на дызельнае паліва ды інш. Больш інфармацыі

**18 красавіка** – Еўракамісія плануе зрабіць паведамленне наконт праграмы роста эканомікі і стварэння новых працоўных месцаў у Грэцыі. Праграма закранае пытанні размеркавання фінансавай дапамогі на працягу наступных трох гадоў, а таксама рэфармавання бізнес-асяроддзя і дзяржаўнага рэгулявання. Больш падрабязна

## Падзеі мінулага тыдня

### Кэтрын Эштан вітае вызваленне Саннікава і Бандарэнкі, заклікае ўлады вызваліць усіх палітычных вязняў

Высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан вітае вызваленне былога кандыдата на пасаду прэзідэнта Андрэя Саннікава і яго паплечніка Дзмітрыя Бандарэнкі. У сваёй заяве Эштан таксама заклікае без усякіх умоў вызваліць

астатніх палітвязняў і скасаваць усялякія абмежаванні іх грамадзянскіх і палітычных правоў.

## Еўранэст узмацняе сувязі з грамадзянскай супольнасцю ў краінах Усходняга партнёрства

Камітэт Парламенцкай Асамблеі Еўранэст па сацыяльных справах, адукацыі, культуры і грамадзянскай супольнасці другі раз сустрэўся па-за межамі ЕС у Баку. Гэтая сустрэча дазволіла еўрапарламентарыям падзяліцца поглядамі з азербайджанскімі грамадскімі арганізацыямі. Камітэт выказаў занепакоенасць у сувязі са зменамі ў патрабаваннях да рэгістрацыі замежных грамадскіх арганізацый у Азербайджане ад 2009 года і фактычнай забаронай на правядзенне мірных сходаў, уведзенай у 2006 годзе.

## Еўракамісія робіць далейшыя крокі ў барацьбе з адмываннем грошай

Еўрапейская Камісія 11 красавіка накіравала ў Еўрапарламент і Савет ЕС справаздачу па ўжыванні на практыцы апошняй, трэцяй дырэктывы супраць адмывання грошай. Справаздача, падрыхтаваная з улікам публікацыі новых міжнародных стандартаў, аналізуе, якія з элементаў цяперашняга заканадаўства неабходна змяніць. Камісія плануе прапанаваць праект чарговай, чацвертай дырэктывы супраць адмывання грошай восенню гэтага года.

## Еўракамісія распачынае дыскусію наконт “Інтэрнета рэчаў”

Еўрапейская Камісія заклікае грамадзян дасылаць свае каментарыі наконт “Інтэрнета рэчаў” – бесправадных злучэнняў паміж рознымі прыстасаваннямі і Інтэрнэтам. Праз усталяваныя чыпы гэтыя рэчы перадаюць, збіраюць і захоўваюць інфармацыю пра свайго ўладальніка ў сусветнай павуціне. Паколькі колькасць такіх рэчаў расце, Еўракамісія жадае высветліць, як развіваць гэтую тэхналогію на карысць грамадству і эканоміцы і разам з тым захаваць правы кожнай асобы на канфідэнцыяльнасць.

## 90% еўрапейцаў жадаюць, каб ЕС дапамагаў бяднейшым краінам выпрацоўваць энергію

95% жыхароў ЕС лічаць, што доступ да сродкаў энергіі – гэта важная перадумова пераадолення беднасці ў краінах, што развіваюцца, кажа апытанне Еўрабарометра. А дзевяць з дзесяці жыхароў жадаюць, каб ЕС дапамагаў людзям у гэтых краінах атрымаць доступ да энергіі. Гэтыя дадзеныя былі апублікаваныя Еўрабарометрам напярэдадні саміта ЕС “Устойлівая энергетыка для ўсіх”, што распачнецца ў Брусэлі 16 красавіка.

## Прамысловая вытворчасць у еўразоне павялічылася на 0.5%

У лютым гэтага года прамысловая вытворчасць вырасла на 0.5% у краінах зоны еўра і на 0.2% у Еўрасаюзе, паведамляе Еўрастат. У студзені гэты паказчык заставаўся стабільным у абедзвюх зонах. У лютым 2012 года, у параўнанні з лютым 2011, прамысловая вытворчасць, аднак, зменшылася на 1.8% як у зоне еўра, так і ва ўсіх 27 краінах ЕС.

**Еўрапейскі цэнтральны банк: Ірландыя можа стаць прыкладам поспеху**

Ірландыя можа стаць прыкладам паспяховага выйсця з крызісу, упэўнены сябра выканаўчага савета Еўрапейскага цэнтральнага банка Йорг Асмусен. Пра гэта ён паведаміў 12 красавіка падчас візіту ў Дублін. Асмусен падкрэсліў, што краіна яшчэ патрабуе моцнай фіскальнай кансалідацыі і правядзення структурных рэформ. Аднак ён таксама адзначыў, што за апошнія паўтара гады Ірландыя ўжо дасягнула значнага прагрэсу і можа стаць "гісторыяй поспеху".

**Еўрапейскі цэнтрабанк акрэсліў сваю ролю ў фінансаванні эканомікі еўразоны**

Бенуа Кёрэ, сябра выканаўчага савета банка, у сваёй прамове 11 красавіка ў Парыжы акрэсліў ролю Еўрапейскага цэнтрабанка ў забеспячэнні стабільнасці зоны еўра. Ён нагадаў пра рызыкі эканомікі зоны еўра ў апошнім квартале 2011 года, патлумачыў, як насычэнне ліквіднасцю дапамагло пазбегнуць хуткага скарачэння фінансавання прыватнага сектара, а таксама разглядзеў цяжкасці, з якімі еўра сутыкнецца ў будучыні.

**У Еўропе расце папулярнасць навучання прадпрымальніцтву**

Навучанне прадпрымальніцтву прасоўваецца ў большасці еўрапейскіх краін, адзначае апошняя справаздача Еўрапейскай Камісіі. Паводле дакумента, палова еўрапейскіх краін праз адукацыйныя рэформы пашырае навучанне такім прадпрымальніцкім навыкам як ініцыятыўнасць, рызыкоўнасць і крэатыўнасць. 12 краін падтрымліваюць навучанне прадпрымальніцтву праз шчыльнае супрацоўніцтва адукацыі і бізнесу як, напрыклад, стварэнне невялікіх фірм, якімі кіруюць студэнты.

**Брысталь, Капенгаген і Франкфурт змагаюцца за тытул зялёнай сталіцы**

Тры фіналіста – Брысталь, Капенгаген і Франкфурт – абраныя сярод 18 еўрапейскіх гарадоў, што спаборнічалі за тытул еўрапейскай зялёнай сталіцы 2014 года. Рада незалежных экспертаў вылучала прэтэндэнтаў па 12 крытэрыях, сярод якіх былі: унёсак у барацьбу са змяненнем клімату, шумавая забруджанасць, спажыванне водных рэсурсаў і перааапрацоўка адкідаў. З часу заснавання тытула ў 2010 годзе яго атрымалі чатыры еўрапейскія гарады.

**Трэнінгі для журналістаў распачнуцца пры падтрымцы Еўракамісіі**

Еўракамісія распачала трохгадовы праект па правядзенні трэнінгаў сусветнага ўзроўню для больш чым 1.200 журналістаў з 17 краін-суседзяў ЕС. Праект "Медыя-суседства" будзе ажыццяўляцца BBC Media Action – кансорцыюмам міжнародных медыя-арганізацый, якія займаюцца навучаннем журналістаў.

**Еўракамісія выдзяляе 74 млн. еўра на супольныя праекты ў галіне міграцыі**

Еўрапейская Камісія пачынае прыём прапаноў у межах "Тэматычнай праграмы па супрацы з трэцімі краінамі ў галіне міграцыі і прытулку". Галоўная мэта гэтай праграмы –

дапамагчы іншым краінам лепш кантраляваць міграцыйныя патокі. Да ўдзелу таксама запрашаюцца краіны-ўдзельніцы Ўсходняга партнёрства. Апошні тэрмін падачы заявак – 1 снежня.

## Сайт тыдня

BBC Media Action – кансорцыюм міжнародных медыйных арганізацый, якія будуць ажыццяўляць праект ЕС “Медыя-суседства”